Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30(682) ● ПЯТНІЦА, 20 кастрычніка 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдания XX

ДЗЕЯЧЫ НАВУКІ І ТЭХНІКІ! БОЛЬШ АКТЫЎНА ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ПАСКАРЭННЕ НАВУКОВА-ТЭХНІЧНАГА ПРАГРЭСУ НАШАЙ РАДЗІМЫ, ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ!

[З Заклікаў ЦК КПСС да 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі].

ТРЫУМФАЛЬНАЯ ПЕРАМОГА САВЕЦКАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

НАПЯРЭДАДНІ 50-годдзя ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

18 кастрычніка 1967 года савецкая аўтаматычная станцыя «Венера-4», прайшоўшы адлегласць каля 350 мільёнаў кіламетраў, дасягнула планеты Венера.

На працягу 4-месячнага палёту станцыя дазволіла атрымаць ковыя шматлікія даныя аб фізічных уласцівасцях касмічнай прасторы.

Пры падлёце да планеты Венера станцыя зафіксавала адсутнасць прыкметнага магнітнага поля і радыяцыйных паясоў планеты. Выяўлена слабая вадародная карона.

Сёння, 18 кастрычніка 1967 года, у 7 гадзін 34 мінуты маскоўскага часу аўтаматычная станцыя «Венера-4» увайшла з другой касмічнай скорасцю ў атмасферу Венеры і ад станцыі аддзяліўся спускаемы апарат— навуковая лабараторыя. Пасля аэрадынамічнага тармажэння спускаемага апарата ў атмасферы планеты аўтаматычна спрацавала спецыяльная парашутная сістэма, і ён працягваў плаўнае зніжэнне ў атмасферы Венеры.

Навуковыя прыборы спускаемага апарата праводзілі няспынныя ўстойлівыя вымярэнні і перадачу на Зямлю параметраў атмасферы Венеры на працягу паўтары гадзіны на адлегласці 25 кіламетраў.

Апарат апусціўся на паверхню планеты, даставіўшы другі вымпел з адбіткам Герба Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Праводзіліся замеры ціску, шчыльнасці, тэмпературы і хімічнага саставу атмасферы Венеры.

На працягласці ўчастка вымярэння тэмпература атмасферы змянялася ад 40 да 280 градусаў Цэльсія, атмасферны ціск — ад 1 да велічыні парадку 15 атмасфер. Вымярэнні паказалі, што атмасфера Венеры амаль поўнасцю складаецца з вуглекіслага газу; кісларод і пара вады складаюць каля паўтара працэнта, прыкметных слядоў азоту не выяўлена.

Даныя навуковых вымярэнняў апрацоўваюцца і будуць апублікаваны.

Такім чынам, савецкая аўтаматычная станцыя «Венера-4» упершыню ажыццявіла плаўны спуск і пасадку на паверхню планеты і дазволіла атрымаць каштоўнейшыя даныя аб планеце Венера.

Навуковыя даследаванні, выкананыя савецкай аўтаматычнай міжпланетнай станцыяй «Венера-4»,— новая выдатная перамога савецкай навукі і тэхнікі, важнейшы этап у даследаванні планет Сонечнай сістэмы.

ГРАМАДСКІЯ НАВУКІ—НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

Адбыўся агульнаўніверсітэцкі партыйны сход, прысвечаны абмеркаванню Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве». З дакладам аб пастанове ЦК КПСС і задачах партыйнай арганізацыі універсітэта выступіў прафесар І. М. Лушчыцкі. Ён адзначыў, што ў новай пастанове Цэнтральны Камітэт прааналізаваў становішча і вызначыў меры па далейшаму развіццю грамадскіх навук, прыцягнуў увагу да грамадзянскай гісторыі, юрыдычных навук, псіхалогіі, літаратуры, журналістыкі. Востра пастаўлена пытанне аб павышэнні ролі марксісцка-ленінскай тэорыі ў сучасную эпоху. Чым гэта выклікана?

У пастанове гаворыцца, што прыцягненне шырокіх мас працоўных у актыўную грамадскую дзейнасць, магутны нацыянальна-вызваленчы рух народаў, вострая ідэалагічная барацьба і іншыя працэсы сусветнага развіцця патрабуюць пастаяннага ўсебаковага аналізу і тэарэтычнага абагульнення з пазіцыі марксізма-ленінізма.

У апошнія гады партыя стварыла спрыяльныя ўмовы для развіцця грамадскіх навук. Вышла другое выданне збору твораў К. Маркса і Ф. Энгельса, поўны збор твораў У. І. Леніна, выпускаецца многатомнае выданне гісторыі КПСС.

Спрыяльна адбіліся на развіцці грамадскіх навук мерапрыемствы па пераадоленню культа асобы, суб'ектывізма і валюнтарызма.

Пастанова ЦК КПСС падводзіць вынік дасягненняў у галіне грамадскіх навук, адзначае вялікую ролю высокакваліфікаваных навуковых і навукова-педагагічных кадраў філосафаў, эканамістаў, гісторыкаў, прадстаўнікоў іншых грамадскіх навук. Гэтыя поспехі пераканаўча адлюстроўваюцца прыкладам роста высокакваліфікаваных кадраў у нас, у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Да 1952 года, напрыклад, у Беларусі не было ні аднаго доктара філасофскіх навук, зараз іх восем. Цяпер ужо і да нас прыязджаюць вучоныя з Масквы, Кіева, Растова, Валгаграда, Рыгі для абароны доктарскіх дысертацый па філасофіі, гісторыі, філалогіі і іншых навуках.

Радасна, што многія высокакваліфікаваныя спецыялісты рэспублікі — выхаванцы нашага універсітэта, нашых кафедраў. Так, з 13 выкладчыкаў кафедры гісторыі філасофіі, логікі і навуковага атэізму 11 выхаваны самой кафедрай. Дзесяць кандыдатаў навук падрыхтавана на кафедры гісторыі КПСС. Амаль такія ж справы на кафедрах дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, палітэканоміі, навуковага камунізма. Рост высокакваліфікаваных кадраў вызначаецца ў галіне грамадзянскай гісторыі, прававых навук, філалогіі і журналістыкі.

На некаторых кафедрах паспяхова ідзе падрыхтоўка доктарскіх дысертацый. Заканчваюць свае даследаванні А. А. Філімонаў, Д. П. Жмуроўскі, А. М. Малашко. Плённа працуюць В. М. Панкратаў, А. У. Самускевіч, А. С. Кляўчэня, А. А. Бірала, С. Д. Лапцёнак. М. Р. Круцько па тэме свайго даследавання выдаў кнігу «Барацьба за дэмакратыю — састаўная частка барацьбы за сацыялізм». А. Д. Гусеў працуе над манаграфіяй «Камунізм і асоба», П. П. Сіліванчык даследуе пытанне аб перамозе культурнай рэвалюцыі на Беларусі. Набліжаюцца да завяршэння манаграфічныя даследаванні С. Я. Янчанкі, І. К. Караленкі, П. У. Грышановіча.

(Працяг на 2-й стар.).

ГІГАНЦКІЯ ПЛАНЫ, ВЕЛІЗАРНЫЯ ЗДЗЯЙСНЕННІ

У сталіцы нашай Радзімы Маскве закончыла работу трэцяя сесія Вярхоўнага Савета СССР, якая падрабязна абмеркавала перспектывы развіцця народнай гаспадаркі краіны на бліжэйшыя тры гады і прыняла адпаведныя законы «Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1968 год і планах развіцця народнай гаспадаркі на 1969 і 1970 гады», а таксама «Аб Дзяржаўным бюджэце СССР на 1968 год».

Зацверджаныя планы — гэта планы мірнага стварэння, далейшага магутнага росту эканомікі і культуры кожнай саюзнай рэспублікі і краіны ў цэлым.

Па Беларускай ССР прамысловая вытворчасць павялічыцца за 1968 год на 10,4 працэнта. Да канца пяцігодкі намячаецца ажыццявіць вялікую праграму капітальных работ па будаўніцтву многіх буйных прамысловых аб'ектаў—Магілёўскага камбіната сінтэтычнага валакна, Полацкага хімкамбіната, па вытворчасці капралактану на Гродзенскім азотнатукавым заводзе, многіх прадпрыемствах лёгкай прамысловасці.

Шпарка будзе набіраць тэмпы новая для рэспублікі галіна — нафтавая прамысловасць. Намечана стварыць новы нафтавы цэнтр, на базе якога будзе развівацца нафтахімічная прамысловасць.

У кожным паказчыку плана, у кожнай лічбе бюджэта мы бачым велізарны размах стваральных работ, новы ўздым эканомікі нашай дзяржавы, матэрыяльнага дабрабыту і культуры народа.

Канкрэтызацыя гэтых велічных планаў зроблена сесіяй Вярхоўнага Савета БССР. У яе рашэннях, прамовах дэпутатаў—незабыўныя факты і лічбы дасягнутых поспехаў і яшчэ больш захапляючых перспектыў нашай рэспублікі ў камуністычным будаўніцтве.

Смольны. У госці да Леніна.
Фота А. Кадзета.

ХРОНІКА

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ

Заканчваюцца справаздачы і выбары ў партыйных арганізацыях універсітэта. На прайшоўшых сходах камуністы па-дзелавому прааналізавалі вынікі мінулага навучальнага года, абагульнілі ўсё каштоўнае, што было набыта ў арганізацыі вучэбнага працэсу, навуковых даследаваннях і палітыка-выхаваўчай рабоце. Разам з тым, на сходах вялікая ўвага была звернута на вызначэнне мер па ліквідаванню ўсё яшчэ існуючых недахопаў у працы.

Дакладчыкі і прамоўцы падкрэслівалі, што камуністы універсітэта шмат зрабілі для таго, каб датэрмінова выканаць сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя ў гонар юбілею Савецкай улады. Калектывы многіх кафедраў ужо рапартавалі аб сваіх высокіх поспехах. Камуністы гуманітарных факультэтаў падрабязна гаварылі аб асабістых і агульных планах па выкананню Пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму развіццю грамадскіх навук і павышэнню іх ролі ў камуністычным будаўніцтве».

На прайшоўшых сходах сакратарамі партыйных бюро абраны: на фізічным факультэце — **Салаў Пётр Лаўрэнцевіч**, на матэматычным — **Шарко Тамара Рыгораўна**, філалагічным — **Захарава Вера Анісімаўна**, журналістыкі — **Пабока Пётр Міхайлавіч**, падрыхтоўчым — **Мельнікаў Уладзімір Аляксеевіч**, хімічным — **Артамонаў Аляксандр Кузьміч**, адміністрацыйна - гаспадарчай часткі — **Кастроў Іван Фёдаравіч**.

Учора адбыліся справаздачна-выбарчыя сходы на астатніх факультэтах.

* * *

Арганізавана прайшлі справаздачы і выбары ў прафсаюзных аб'яднаннях выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Старшынямі прафбюро абраны: на гістарычным факультэце — **У. А. Ціток**, юрыдычным — **Е. М. Тагуноў**, хімічным — **І. Ф. Кананюк**, фізічным — **К. В. Сабіла**, матэматычным — **М. А. Лукашэвіч**, біялагічным — **Л. В. Камлюк**, геолага-геаграфічным — **К. К. Кудло**, журналістыкі — **Е. Л. Бондарава**, філалагічным — **Н. С. Мажэйка**, падрыхтоўчым — **Р. П. Лучанок**.

ГРАМАДСКІЯ НАВУКІ — НА ПЯРЭДНІМ КРАІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-ай стар.).

У апошнія гады некалькі сур'ёзных манаграфічных прац выпусцілі гісторыкі.

Выдана манаграфія У. М. Сікорскага «Сусветны рэвалюцыйны працэс і сучасны сацыялрэфармізм», якая атрымала высокую ацэнку ў друку. Аўтару за гэтую працу прысуджана вучоная ступень доктара філасофскіх навук.

Дацэнты кафедры гісторыі КПСС Т. І. Прытыцкая і А. В. Царук — аўтары нядаўна выданай кнігі «Баявы шлях Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі». Хутка выйдуць у свет «Нарысы гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі», адным з аўтараў і рэдактараў іх з'яўляецца прафесар М. Я. Шкляр. Дацэнт В. Г. Івашын і прафесар І. М. Ігнаценка выдалі кнігу «Вялікі Кастрычнік у Мінску».

Калектывам кафедры падрыхтаваны да друку курс лекцый па гісторыі КПСС (1937—1967 гг.). Кафедра палітэканоміі выдала ў 1966 годзе кнігу «Ад капіталістычнай да камуністычнай эканомікі», брашуру У. А. Кулажанкі і У. В. Цакунова «Эканамічная эфектыўнасць інтэнсіфікацыі вытворчасці ў калгасах». Выкладчыкі кафедры дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму працуюць над праблемамі тэорыі пазнання, філасофіі фізікі, заканамернасцей перарастання сацыялізма ў камунізм.

Кафедрай гісторыі філасофіі, логікі і навуковага атэізму распрацаваны тры вучэбныя дапаможнікі. Гэта кафедра выдала таксама кнігу С. Д. Лапцёнка «Мараль і сям'я» і рыхтуе да выпуску «Філасофію праваслаўя» В. А. Молакова.

Многа цікавых і змястоўных прац на ўліку юрыстаў. Сярод іх трэба адзначыць «Нарысы па гісторыі дзяржавы і права БССР».

Адзначыўшы поспехі, прафесар І. М. Лушчыцкі спыніўся на недахопах навуковых даследаванняў, сканцэнтраваў увагу на задачах, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй універсітэта. Першачарговыя з іх:

Дасягнуць павышэння якасці навуковых прац, уважліва, глыбока і ўсебакова абмяркоўваючы кожны рукапіс, які рыхтуецца да друку, шырока развіваючы крытыку і самакрытыку.

Аб'яднаць намаганні вядучых філосафаў, эканамістаў і гісторыкаў для арганізацыі комплексных даследаванняў па важнейшых навуковых праблемах.

Тэматыку кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый у далейшым вызначаць у суадносінах з патрабаваннямі Пастановы ЦК КПСС.

Наладзіць публікацыю навуковых прац. Паскорыць арганізацыю выдавецтва універсітэта.

Выступаючы ў спрэчках па дакладу, загадчык кафедры навуковага камунізма М. Р. КРУЦЬКО спыніўся на пытаннях вучэбна-педагагічнай работы. На жаль, гаворыць тав. Круцько, у вывучэнні марксісцка-ленінскай тэорыі ёсць нямала недахопаў. Некаторыя студэнты ў час гадавых і выпускных экзаменаў паказваюць не зусім добрыя веды. Распрацоўваючы практычныя меры паляпшэння выкладання грамадскіх навук, неабходна звярнуць увагу на павышэнне навуковага і метадычнага ўзроўню лекцый і семінарскіх заняткаў.

Мы ўдзялялі многа ўвагі зместу выкладання, гаворыць тав. Круцько, але недастаткова методыцы, вобразнасці і эмацыянальнасці, яны пакуль застаюцца на другім плане. Важнае пытанне — умацаванне матэрыяльнай базы кафедр грамадскіх навук. Цяпер на кожнай з іх ёсць вучэбныя кабінеты, варта было б падумаць аб іх канцэнтрацыі і аб'яднанні намаганняў.

Далей тав. Круцько гаворыць аб неабходнасці каардыніраваць дзейнасць кафедр і навуковых даследаванняў, аператыўней вырашаць вучэбна-метадычныя пытанні, паўней ўлічваць спецыфіку работы на падрыхтоўчым факультэце.

Загадчык кафедры матэматычнага факультэта Ф. Д. ГАХАЎ прааналізаваў паспяховасць студэнтаў па грамадскіх дысцыплінах і адзначыў, што яна не горшая, чым па спецыяльных прадметах. Найбольш добрыя вынікі там, дзе выкладанне вядзецца падрыхтаванымі, высокаэрудыраванымі спецыялістамі, умела і зацікаўлена працуючымі з моладдзю.

Аб выкладчыках, якія ўмеюць зацікавіць студэнтаў грамадскімі навукамі, змястоўна вядуць семінарскія заняткі гаварыў студэнт трэцяга курса хімічнага факультэта С. СТРОЙКІН. Ён падкрэсліў вялікую цікавасць студэнтаў да філасофскіх пытанняў фізікі, хіміі, матэматыкі.

Аб справах кафедры палітэканоміі расказаў выконваючы абавязкі загадчыка кафедры П. У. ГРЫШАНОВІЧ.

Улічваючы вядучую ролю лекцый, выкладчыкі на пасяджэннях кафедры сістэматычна абмяркоўваюць тэксты лекцый. Многія члены кафедры паспяхова працуюць над доктарскімі і кандыдацкімі дысертацыямі.

П. У. Грышановіч зрабіў сур'ёзны папрок у адрас работнікаў бібліятэкі, якія дрэнна камплектуюць фонд вучэбнай літаратуры. Падручнікі і перыядычныя выданні, якія карыстаюцца вялікім запатрабаваннем, маюцца толькі ў адзінкавых экзэмплярах. Не задавальняе і работа кабінета. У ім, як і некалькі гадоў назад, усяго два супрацоўнікі, хоць за гэты час створана новае аддзяленне, павялічылася колькасць студэнтаў і аспірантаў.

Загадчык кафедры І. А. ЮХО далажыў сходу аб навуковай і грамадскай рабоце юрыстаў, звярнуў увагу на той факт, што на факультэце да гэтай пары няма ніводнай навуковай лабараторыі ці кабінета, што дрэнна адбываецца на навуковых даследаваннях. І. А. Юхо падтрымлівае выказаны ў дакладзе прапановы аб стварэнні ў рэспубліцы часопіса па грамадскіх навуках.

Сход аднадушна адобрыў Пастанову ЦК КПСС і прыняў рэзалюцыю, у якой знайшлі адлюстраванне меры па паляпшэнню выкладання грамадскіх навук і даследаванняў.

Лабарант кафедры ядзернай фізікі Л. Гладкі ў дапамогу студэнтам сабраў і наладзіў новы лічыльнік Гейгера — Мюллера для вывучэння ядзерных вылучэнняў.

На здымку: Л. Гладкі каля сабранага ім лічыльніка.

Фота Я. БЫКАВА.

ТРАДЫЦЫЙНЫ СТУДЭНЦКІ

У мінулую нядзелю студэнты Мінска ўрачыста адзначылі свой дзень. Стаўшае традыцыйным свята сталічнага студэнцтва на гэты раз прайшло пад дэвізам дастойнай сустрэчы слаўнага юбілею — 50-годдзя Савецкай улады. На сустрэчах з ветэранамі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, на вечарах юнакі і дзяўчаты рапартавалі партыі, камсамолу аб сваіх поспехах у вучобе, удзеле ў будаўніцтве на цаліне, у калгасах і саўгасах рэспублікі.

Каля двух тысяч студэнтаў нашага універсітэта прынялі ўдзел ва ўрачыстым шэсці. Яны выйшлі на вуліцы роднага горада са сцягамі, заваёванымі будаўнічымі атрадамі. Цікава прайшоў вечар у гуманітарным корпусе. Студэнтаў віталі старэйшыя камуністы, а таксама маракі з падшэфнага Чырвонасцяжнага Балтыйскага Флоту. У заключэнне адбыўся вялікі канцэрт.

Мінчане цёпла сустрэлі выступленне вядомага ў горадзе універсітэцкага эстраднага аркестра. Канцэрт адбыўся ў Зялёным тэатры парка імя Горкага. Нашы студэнты набывалі ў гасцях у сваіх сяброў у інстытуце народнай гаспадаркі, дзе актыўна прынялі ўдзел у інтэрнацыянальным вечары, у іншых вышэйшых навучальных установах сталіцы.

І. КОТАЎ.

ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

БЮРО ЗДАЕ ЭКЗАМЕН

Сабраўшыся на канферэнцыі, члены прафсаюза — студэнты філалагічнага факультэта, падвялі вынік усяго таго, што зроблена за год стараннай працы.

Старшыня прафбюро студэнт чацвёртага курса Віктар Захарчук у сваім дакладзе звярнуў увагу на тое, як выконвалі свае абавязкі члены бюро ў галіне навуковай дзейнасці, вучобы, арганізацыі адпачынку.

Калі прафсаюзнае бюро не знаходзіцца ў цеснай сувязі са студэнтамі, яно не можа мець адпаведных поспехаў у працы. Іменна такое становішча, як зазначыў прамоўца, склалася на філалагічным факультэце. Члены прафбюро ў асноўным працавалі ахвотна, але многія з іх адразу пасля выбрання не мелі пэўнага вопыту. З мэтай павышэння арганізацыйнага ўзроўню актывістаў было праведзена некалькі семінараў прафоргаў, на якія запрашаліся як члены прафбюро факультэта, так і прафоргі курсаў, груп. Але, на жаль, наведвалі гэтыя семінары не ўсе.

Акрамя семінараў, члены прафбюро часта праводзілі індывідуальныя гутаркі. Прафоргамі (праўда не ўсімі) запаўнялася дзённікі прафсаюзных груп і курсаў. Многа карыснага для факультэта зрабілі члены навукова-акадэмічнай камісіі Іна Фянчук, Вечаслаў Дашкевіч, члены санітарнай камісіі Ларыса Краўчанка, Анатоль Ліпскі, жыллёва-бытавой — Фёдар Клімавец, спартыўна-масавай — Аляксандр Камароўскі і многія іншыя.

Камендант інтэрната № 4 Г. М. Рабцэвіч гаварыў аб поспехах і недахопах работы прафбюро. У пакоях яшчэ даволі часта можна бачыць бутылкі з-пад спіртнога, паломаныя крэслы, пабітыя вокны. Побач з лепшымі пакоямі, якія заўсёды знаходзяцца ў чысціні, ёсць і такія, для якіх двойка па санітарыі стала звычайнай ацэнкай.

Ларыса Краўчанка, студэнтка трэцяга курса аддзялення рускай мовы і літаратуры, зрабіла правільны папрок у адрас прафбюро за тое, што яно не трымала цеснай сувязі з камсамольскай арганізацыяй у вырашэнні найбольш важных праблем факультэта. Віна ў гэтым у сваю чаргу, як зазначыла Ларыса, і камітэта камсамола, які таксама не праяўляў асаблівай ініцыятывы.

Недастатковай была сувязь прафбюро і са студэнтамі груп, якія без аганьку браліся за даручаную ім справу. Сам Віктар Захарчук адзначыў, што гэтая сувязь праяўлялася толькі тады, калі пытанні датычыліся адной асобы, калі трэба было каго-небудзь са студэнтаў па меры неабходнасці пасяліць або выселіць з інтэрната, і не больш.

Прафсаюзная канферэнцыя філфака прайшла пры высокай актыўнасці яе ўдзельнікаў. Было і яшчэ многа цікавых і карысных выступленняў, і усе выступаючыя прадугледжвалі адну мэту — павысіць ролю прафсаюзнай арганізацыі ва ўсіх галінах яе дзейнасці на факультэце.

У састаў новага прафсаюзнага бюро ўвайшлі лепшыя студэнты-актывісты. Ім многае патрэбна зрабіць для таго, каб яшчэ больш узняць аўтарытэт сваёй прафсаюзнай арганізацыі.

В. ЗІМІН.

КАНФЕРЭНЦЫЯ СУПРАЦОЎНІКАЎ

Адбылася агульнаўніверсітэцкая прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў. З дакладам аб рабоце мясцкома выступіў яго старшыня дацэнт І. Т. Рагоўскі. Канферэнцыя заслухала таксама справаздачу рэвізійнай камісіі. Абраны новыя органы прафсаюзнай арганізацыі.

Частым госцем студэнтаў універсітэта з'яўляецца адзін са старэйшых камуністаў Мінска Міхаіл Іосіфавіч Кароль. Яго ўспамін аб гераічным мінулым савецкага народа натхняюць моладзь на новыя поспехі ў вучобе.

Фота І. АСКІРКІ.

ПРЫКЛАД, ВАРТЫ ПЕРАЙМАННЯ

У гэтым навучальным годзе не ў прыклад мінулым на юрыдычным факультэце значна палепшылася работа камітэта камсамола. Тут арганізавана і пры высокай актыўнасці прайшлі камсамольскія сходы першакурснікаў і выпускнікоў, агітатарамі і камсоргамі ў большасці абраны камуністы, людзі, якія прайшлі ўжо немалую жыццёвую дарогу, накапілі некаторы вопыт выхаваўчай работы сярод моладзі.

Нядаўна камсамольскі актыў першых курсаў вырашыў выпускаць насценную газету «Першакурснік» — дадатак да «Савецкага юрыста».

А калі атрымалі адабрэнне, адразу ж уключыліся ў работу. І вось № 1 «Першакурсніка» з'явіўся на свет. У газеце выступіла каля дзесятка тых, хто ўліўся ў студэнцкі калектыў юрфака ў гэтым навучальным годзе. Сваімі ўражаннямі аб універсітэце, аб лекцыях, семінарах, выкладчыках, студэнцкім жыцці ў інтэрнатах дзеліцца неўрымслівая камсамолія.

З нараджэннем цябе, «Першакурснік»!

С. РУДЗЕНСКІ.

ВЫДАТНАЯ ЗАЯЎКА

Усесаюзны агляд навуковых студэнцкіх даследаванняў па праблемах грамадскіх навук, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, прысвечаны 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, падыходзіць да фінішу. У Беларусі падведзены вынікі другога туру агляду. Як ужо паведамлялася, 12—13 кастрычніка ў нашым універсітэце адбылася рэспубліканская навуковая студэнцкая канферэнцыя. У старэйшую навучальную ўстанову Беларусі — ардэнаносны універсітэт сабраліся маладыя даследчыкі з інстытутаў Мінска і Віцебска, Гродна і Магілёва, Брэста, Горак, Гомеля. Па сутнасці яны прадстаўлялі ўсё беларускае студэнцтва, якое прымала актыўны ўдзел у ганаровым спаборніцтве за стварэнне лепшых прац па кастрычніцкай тэматыцы.

У першы дзень адбылося пленарнае пасяджэнне канферэнцыі. Непазбежная ў такіх выпадках урачыстасць прыдала яшчэ больш дзелавітасці яе рабоце. Затым гаспадары і госці разышліся па інстытутах сталіцы на прадметныя секцыі. Секцыя гісторыі КПСС працавала ва універсітэце.

Вынікі канферэнцыі былі падведзены ў наступны дзень. Адзін за другім на трыбуну падымаюцца кіраўнікі секцый — дацэнты М. Р. Круцько, В. І. Мартавіцкі, А. Я. Жураў, В. С. Аксельрод, В. І. Старавойтаў. Яны адзначаюць, што пасяджэнні прайшлі арганізавана, студэнты і прыняўшыя ўдзел у канферэнцыі выкладчыкі з вялікай цікавасцю праслухалі выступленні юных даследчыкаў, далі высокую аб'ектыўную ацэнку дакладам. Было падкрэслена, што ўсе прадстаўленыя на гэты форум працы напісаны на высокім навуковым узроўні, сведчаць і аб здольнасці іх аўтараў, і аб тым, што ў вышэйшых навучальных установах нашай рэспублікі вядзецца вялікая работа па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх ужо на студэнцкай парце авалодваюць сакрэтамі навуковых даследаванняў.

У гэты дзень пахвалу ў свой адрас пачулі студэнт Мінскага педінстытута М. Мартынаў, віцябляне В. Закрэўская, Л. Крычун, Л. Карабанава і З. Воранава, студэнт Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута У. Алейнікаў, даклад якога аб дзейнасці Скідзельскага падпольнага райкома камсамола ў гады Айчыннай вайны рэкамендаваны да друку ў маладзёжных газетах, студэнтка Мінскага інстытута замежных моў С. Жыжэль і многія іншыя. Нам вельмі прыемна паведаміць сваім чытачам, што ўсе даклады універсітэцкіх аўтараў атрымалі высокую ацэнку.

Цікавасць і адабрэнне на секцыі гісторыі КПСС выклікалі выступленні Т. Глушаковай, А. Кухто. Л. Ніцеўская парадавала эканамістаў. Кіраўнікі секцый станоўча ацанілі здольнасці нашых «студэнцкіх вучоных» Е. Сажнева, М. Міранды, А. Крук, Л. Колабавай, В. Шалькевіча.

Вынікі падведзены. Слова прадстаўляецца сакратару ЦК ЛКСМБ Р. Піонавай. Яна сардэчна віншуе ўдзельнікаў канферэнцыі з поспехамі і ўручае пераможцам рэспубліканскага агляду Ганаровыя граматы ЦК камсамола Беларусі. Сярод узнагароджаных пяць нашых дзяўчат: М. Міранда, А. Кітова, Л. Крошкіна, Л. Колабава і Л. Брыгадзіна. Многія студэнты інстытутаў атрымліваюць каштоўныя падарункі. Апладысментамі сустракаюць прысутныя паведамленне, што матэрыялы канферэнцыі будуць надрукаваны ў зборніку навуковых прац.

І зноў да стала прэзідыума падыходзяць юнакі і дзяўчаты. Уручаюцца граматы і каштоўныя падарункі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Унушальна выглядзіць наша дэлегацыя ўзнагароджаных. Іх — каля дваццаці чалавек. Гэта студэнты Глушакова, Стадуб, Місуна, Траскуноў, Крук, Сажнеў, Вадап'янава, Кухто, Брытаў, Сільвановіч, Ладысеў і іншыя. Адчуваецца, што ім трошкі няёмка перад гасцямі, але ж перамога ёсць перамога. Яна дасталася немалой цаной. Лепшыя даклады — старанныя пошукі фактаў, іх абагульненне і аналіз, стосы прачытаных кніг... Дзесяткі, а можа і сотні старонак перакрэслена, пакуль з-пад пяра не выйшлі тыя, якія склалі глыбокае даследаванне.

Вярнуўшыся на сваё месца, кожны кідае вясёлы позірк на свайго навуковага кіраўніка, каб разам радавацца поспеху. У гэтых позірках яскравае сведчанне вялікай удзячнасці моладзі сваім прафесарам, дацэнтам, якія аддаюць усе сілы і веды сваёй будучай змене, сведчанне жыццятворнай пераемнасці бацькоў і дзяцей.

Так, канферэнцыя, адлюстраваўшы размах і плён навуковых студэнцкіх даследаванняў, з'явілася і важнай палітычнай падзеяй у жыцці не толькі камсамола, моладзі рэспублікі, але і ўсяго беларускага народа. Гэта была сустрэча пакаленняў, на якой сыны і дочкі тых, хто змагаўся за перамогу ўлады Саветаў і вынес на сваіх плячах цяжар вайны і мірнага будаўніцтва, сваімі першымі навуковымі працамі, нават выбарам тэм даследаванняў давалі клятву, што яны пойдуць і ўжо ідуць дарогай бацькоў, дарогай Кастрычніка.

Шчаслівай дарогі!

А. ЛЕБЕДЗЕЎ.

БУДАЎНІКІ «ЮБІЛЕЙНАГА»

Будаўнічы атрад філалагічнага факультэта «Зубронак» ужо другі год працуе на цаліне. Сёлета атрад быў у саўгасе «Краснагорскі» Чапаеўскага раёна. За два месяцы студэнты атрада «Зубронак» пабудавалі на голым месцы цэлы пасёлак — «Юбілейны». Яны некалькі разоў выступалі перад рабочымі саўгаса з канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Са сцэны клуба гучалі песні аб роднай Беларусі, аб нашай моладзі.

На здымку: (злева направа) наш майстар Уладзімір Раіцкі, камандзір атрада Алег Слука і камісар атрада Фёдар Кулакоў пяюць песню «Салдацкія сны». Акампануе Гена Стрыжэвіч.

Фота і тэкст І. АСКІРКІ.

ВУЧЭБНА-ВЫТВОРЧЫЯ



Кожны дзень у вучэбна-вытворчыя майстэрні універсітэта прыходзяць студэнты фізічнага і хімічнага факультэтаў. Тут яны набываюць самыя розныя і неабходныя для іх спецыяльнасці: слесараў, токараў і іншыя.

Вядома, што для студэнтаў гэтых факультэтаў навучанне такім прафесіям павінна быць неад'емным ад асноўнай вучобы. Студэнтам трэба добра разбірацца ў тэхнічных прыборах, у складаным абсталяванні лабараторый.

Міхаіл Іванавіч Юзэфовіч, загадчык вучэбна-вытворчых лабараторый, расказвае аб поспехах, якіх дабіліся студэнты ў авалоданні новымі спецыяльнасцямі.

— Практыка ў цэхах выхоўвае ў моладзі пачуццё адказнасці, працавітасць і дысцыпліну. Паглядзіце, як уважліва слухаюць яны майстра.

І сапраўды, вакол такарнага станка стаяла група студэнтаў і пазнавала сакрэт металаапрацоўчага механізма.

— Мы не толькі навучаем студэнтаў тэорыі, але і разам з імі выконваем вытворчыя задачы — робім рамонт абсталявання, рыхтуем прыборы, — працягвае М. Юзэфовіч.

Цэхі радыёмантажа, шкловыдування, фатаграфіі, слясарны, такарны, сталярны цяпер пастаянна перавыконваюць вытворчы план. Раней, калі не хапала спецыялістаў для высокакваліфікаванай работы, іх прыходзілася запрашаць з іншых установ і прадпрыемстваў. Цяпер жа — у майстэрнях амаль усе спецыялісты высокага класа. Сярод іх шмат рацыяналізатараў. Так, механік Ю. Елісееў, камуніст, які карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калектыве, нядаўна разам з К. Аўтушка сканструяваў машыну для хімічнай і фізічнай чысткі паркетнай падлогі. Гэта намнога аблегчыць працу прыбіральшчыц і паркетчыкаў.

Неабходна адзначыць і яшчэ адно вынаходніцтва — прыбор для змешвання хімічных прэпаратаў і рэактываў. Вучоныя засталіся вельмі ўдзячны вынаходніку. А сталяры Г. Варашылаў і М. Аўсянка зрабілі па-новаму праекту разгорнутыя класныя дошкі, якія знайшлі месца ў многіх аўдыторыях фізічнага факультэта. Яны вельмі зручныя для карыстання.

Камуністы вучэбна-вытворчых майстэрань, а іх 5 чалавек, з'яўляюцца ініцыятарамі ўсіх карысных спраў. Ім аказваюць вялікую дапамогу і беспартыйныя.

Выключна ўсе наведваюць палітычныя заняткі, ахвотна павышаюць свой ідэйны ўзровень.

На партыйным сходзе фізічнага факультэта ў адрас рабочых і механікаў майстэрань было сказана многа цёплых слоў. Наш ардэнаносны універсітэт уваходзіць у лік лепшых універсітэтаў краіны. Гэта абавязвае калектыў рабочых і служачых вучэбна-вытворчых майстэрань палепшыць якасць выпускаемай прадукцыі. Ад гэтага залежыць практычная падрыхтоўка студэнтаў, якія павінны ўмець працаваць з прыборамі, зробленымі высокакваліфікаванымі спецыялістамі майстэрань.

Наперадзе — вялікія планы. Міхаіл Іванавіч ужо абдумвае, як лепш арганізаваць вытворчасць. З новага года павінны перайсці на гаспадарчы разлік. Тады гэты невялікі працавіты калектыў унясе яшчэ большы ўклад у агульную працоўную справу універсітэта.

Б. СІДАРОВІЧ.

На здымку: Механік вучэбна-вытворчых майстэрань Ю. Р. Елісееў, на падліку якога многа карысных прапаноў.

Фота Я. Быкава.

ВЕСТКІ НАВУКОВАГА ЖЫЦЦЯ

⊙ У Горках адбылася Юбілейная занальная навуковая канферэнцыя па праблемах генетыкі, селекцыі і зерняводства раслін. У ёй прынялі ўдзел вучоныя акадэмій навук СССР і БССР, Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя У. І. Леніна, 44 навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, Украіны, Літвы, Эстоніі, Кіргізіі, многіх абласцей Расійскай Федэрацыі, супрацоўнікі вопытных станцый, аграномы-зерняводы. З асноўным праграмным дакладам «Генетыка СССР за 50 год Савецкай улады» выступіў прафесар нашага універсітэта акадэмік Акадэміі навук БССР П. Ф. Ракіцкі. Цікавыя паведамленні аб новых даследаваннях у юбілейным годзе зрабілі яго вучні з універсітэта.

⊙ Дацэнт кафедры гісторыі КПСС А. Я. Жураў абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук. Тэма яго даследавання — «Дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі па стварэнню і кіраўніцтву ЛКСМ (1918—1925 гг.)».

У той жа дзень адбылася абарона кандыдацкай дысертацыі Н. А. Чэхуціным на тэму: «Крытыка У. І. Леніным буржуазнай палітычнай эканоміі Расіі ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя і яе значэнне для выкрыцця сучасных антымарксісцкіх эканамічных тэорый».

⊙ Адзін з вядучых вучоных універсітэта М. А. Ельяшэвіч удзельнічаў у рабоце IX Еўрапейскага навуковага кангрэса па малекулярнай спектраскапіі. Днямі ён выступіў перад студэнтамі і выкладчыкамі з цікавым расказам аб выніках гэтага форума.

⊙ Адбылося пасяджэнне навуковых супрацоўнікаў сацыялагічнай лабараторыі, створанай нядаўна пры універсітэце. Асноўным напрамкам яе работы будзе вывучэнне эфектыўнасці ідэалагічнай работы ў рэспублікі. Кіруе лабараторыяй прафесар І. М. Лушчыцкі.

...ЛІТАРАТУРНАГА

⊙ У кастрычніцкай кніжцы часопіса «Полымя» дацэнт кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта С. Александровіч выступае з артыкулам «Загадваючы далёкае і блізкае», прысвечаным 60-годдзю Р. Сабаленкі. У гэтым жа нумары друкуюцца работа нашага маладога даследчыка С. Гусака «Пафас праўды» і рэцэнзія дацэнта Д. Бугаёва на зборнік апавяданняў І. Чыгрынава «Самы шчаслівы чалавек».

⊙ Новыя вершы Ніла Гілевіча ў кастрычніцкім нумары змясціў часопіс «Беларусь».

⊙ Адзін з маладых нашых студэнцкіх паэтаў, член літаратурнага аб'яднання «Узлёт» трэцякурснік Юра Голуб друкуе свае новыя творы ў «Маладосці».

НОВЫЯ ДАКУМЕНТЫ АБ БАГУШЭВІЧУ

Вывучаючы матэрыялы па тэме дысертацыі ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР, аспірант І. Саламевіч выявіў новыя дакументы аб жыцці, дзейнасці вядомага беларускага паэта Францішка Багушэвіча. Гэта два лісты да Я. Карловіча ад 4 лютага і 19 красавіка 1890 года.

Першы прадстаўляе цікавасць для даследчыкаў тым, што ў ім прыводзіцца тэкст верша «Мая дудка», які быў змешчаны ў зборніку паэта «Дудка беларуская». Гэта адзін з варыянтаў багушэвіцкага верша і цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што ён напісаны не пазней 4 лютага 1890 года. Характэрна, што ліст падпісаны псеўданімам «А. Д.». Такім чынам, здагадка С. Александровіча аб выступленні Ф. Багушэвіча ў польскім друку пад псеўданімам «А. Д.» знайшла яшчэ адно падцвярджэнне.

Другое пісьмо не зусім зразумелае. У ім гутарка ідзе аб нейкай бандэролі, так і не атрыманай Ф. Багушэвічам. Што складала бандэроль, не ўказваецца. Можна прадугадваць, што ў пасылцы былі або рукапісы паэта, або адпраўленыя Я. Карловічам яму кнігі, да якіх адрасат не хацеў прыцягваць увагу паштовых цэнзараў.

Іванам Саламевічам знойдзены таксама тэксты некалькіх вершаў Ф. Багушэвіча, матэрыялы аб надрукаваных ім артыкулах па беларускаму фальклору і этнаграфіі.

Артыкул аспіранта універсітэта аб вільнюскіх знаходках, змешчаны ў газеце «Літаратура і мастацтва», выклікаў вялікую цікавасць літаратуразнаўцаў.

К. МЯЦЕЛЬСКІ.

УСЕ НА КРОС!

ЛЁГКААТЛЕТЫЧНЫ ПРАФСАЮЗНА-КАМСАМОЛЬСКІ КРОС АДБУДЗЕЦЦА Ў НЯДЗЕЛЮ, 22 КАСТРЫЧНІКА, У ПАРКУ «ПЕРАМОГА».

КРОС ПРЫСВЯЧАЕЦЦА 50-ГОДДЗЮ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ. ПАЧАТАК А 10 ГАДЗІНЕ.

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ, ПРЫМЕМ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У ПРАДСВЯТОЧНЫМ КРОСЕ!

ШАШКІ

Пачаліся фінальныя ігры першынства БССР па міжнародных шашках. Сярод прэтэндэнтаў на прызавыя месцы студэнты матфака майстар спорта Анатоль Гантварг і Барыс Агашын, а таксама выпускнік універсітэта Марат Геллер.

□ □ □

Каманда «Буравесніка» узнагароджана залатымі медалямі за перамогу ў рэспубліканскім першынстве ДСТ і ведамстваў па шашках. У калектыве з васьмі спартсменаў пяць — нашы універсітэцкія. Гэта члены шашачнага клуба Я. Соркіна, А. Хапалюк, А. Гантварг, Я. Кухарчук і У. Беляеўскі.

□ □ □

Майстар спорту студэнтка пятага курса матфака Лена Соркіна і стажор кафедры электронна - матэматычных машын кандыдат у майстры спорта Анна Хапалюк выехалі ў Кіславодск для ўдзелу ў фінале першынства СССР па рускіх шашках. Іх трэнерам зацверджан студэнт другога курса матфака, чэмпіён БССР па шашках Уладзімір Беляеўскі.

НАВОШТА ПАДРАЗАЦЬ КРЫЛЫ

Два гады назад студэнты нашага універсітэта Наташа Шумская, Генадзь Сцяпко, Вячаслаў Маркоўскі і іншыя здзяйснялі свой першы крок у неба. Мала, праўда, засталося іх да канца выпуска. Усяго 15 чалавек. Але затое як радаваліся усе ва універсітэце за шчасліўчыкаў. Перажывалі і я за сваіх выхаванцаў. Як зараз памятаю дзяўчат і хлопцаў у спартыўных касцюмах. Дый забыць іх нельга.

У мінулым годзе яны зноў прыйшлі працягваць вывучаць парашутную справу. І не проста прыйшлі, а прывялі з сабою дзесяткі смельчакоў. 80 дзяўчат і 25 юнакоў з дзесяці факультэтаў записаліся у секцыю парашутнага спорту. Для заняткаў ва універсітэце вылучылі аўдыторыю, якую мы тут жа абсталявалі пад парашутны клас. У час заняткаў секцыі неаднаразова дэманстраваліся вучэбныя кінафільмы, якія выклікалі ў навічкоў вялікую цікавасць да парашутнага спорту.

Парашутная секцыя, створаная на грамадскіх пачатках, неўзабаве стала адной з вядучых ва універсітэце. Крыўдна, што нас не падтрымліваюць вышэйстаячыя арганізацыі ДТСААФ рэспублікі.

Вось і зараз жадаючых займацца гэтым цікавым відам спорту вельмі многа, а матэрыяльная база па-ранейшаму застаецца неукамплектаванай. Дый якая гэта база, калі на 100 парашутыстаў маецца толькі 4 парашуты.

Ведаюць аб гэтым і ў рэспубліканскім Доме ДТСААФ, але пра дапамогу не думаюць. Абяцалі, праўда, аблегчыць працу з навічкамі. Як быццам бы і шэфства вырашылі ўзяць (інструктараў у дапамогу абяцалі). Але справа і на гэты раз далей размоў не пайшла.

А колькі перажыванняў было ў час практычных скачкоў з самалёта? Вядома, што вясна для студэнтаў — пара экзаменаў і залікаў. І нягледзячы на гэта, многія студэнты, якія здаўна марыць пра першы палёт у неба, пераносілі экзамены і залікі на іншыя дні, ехалі на аэрадром. Пра гэта добра ведае камандзір парашутнага звяна С. Славашэвіч. Вядомы яму і рэгламент часу, якім жывуць студэнты. Закончылася сесія—і студэнты ўсе без выключэння спяшаюцца хто куды. Адных кліча цаліна, будоўлі Сібіры, іншых—паходы, экскурсіі. А як жа з тымі, хто не паспеў ажыццявіць сваю мару? На гэтае пытанне С. Славашэвіч сказаў так: «Вас вельмі многа, і таму скокнуць летам змогуць толькі тыя, хто застанецца жыць у Мінску». Незразумела, чаму ж так? Вядома, хто гарыць жаданнем выканаць разрадны нарматыў спартсмена-парашутыста, той, безумоўна, застанецца на аэрадроме. Але для большасці гэта немагчыма.

Толькі што пачаўся новы навучальны год. Аудыторыі універсітэта запоўніліся навічкамі. Як можна іх агітаваць займацца парашутызмам, калі на справе яны не змогуць падыйсці да самалёта.

Але ж кожны, хто прыйшоў у парашутную секцыю, ідзе не проста так. Яго кліча рамантыка неба, блакітныя прасторы.

Дык навошта ж падразаць моладзі крылы? Відавочна, супрацоўнікі рэспубліканскага Дома ДТСААФ забылі аб тым, што парашутыста, які не пабывау у небе, нельга называць спартсменам-парашутыстам.

В. ОЗЕРАЎ,
кіраўнік парашутнай секцыі універсітэта.

(«Фізкультурнік Беларусі», 17 кастрычніка 1967 г.)



ПОЗНЯЯ ВОСЕНЬ. ВЫСТАЯЎ!

Фота А. МАРОЗА.

СХОД АСПІРАНТАЎ

У галоўным корпусе універсітэта адбыўся сход аспірантаў сёлетняга прыёму. З цёплым прывітальным словам выступіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар В. І. Сцяпанаў. Ён павіншаваў прысутных з паступленнем у аспірантуру БДУ імя У. І. Леніна, расказаў гісторыю стварэння «кузні навуковых кадраў», пра яе багатыя традыцыі, аб выпусніках. У заключэнне прафесар спыніўся на прыкладных планах вучобы і самастойнай работы аспірантаў.

І. ШВЕДАЎ.

ДА 20-ГОДДЗЯ Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Газетныя старонкі, пашматаныя і пажоўклыя ад часу, глядзяць на мяне жывой гісторыяй майго універсітэта. У іх, як у люстры, адбіваецца ўсё тое, чым жыла, куды імкнулася моладзь пасляваенных часоў, моладзь, якой прышлося спазнаць усе жахі фашысцкага нашэсця, шчасце перамогі і радасць стваральнай аднаўленчай працы, чым жылі прафесары і выкладчыкі, чыя нястомная энергія служыла святой справе навукі, адзінай мэце — хутчэй аднавіць разбураную вайной народную гаспадарку, даць краіне высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Нельга здзіўляцца таму, што на старонках многатыражкі пад нумарам 17 за 1948 год змешчана многа студэнцкіх матэрыялаў, у якіх аўтары расказваюць аб сваіх баявых дзеяннях на франтах і ў партызанскіх атрадах у час вайны.

Адным з памятных дзен майго баявога жыцця ў гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца дзень 7 ліпада 1941 года.

Наша батарэя займала тады агнявую пазіцыю недалёка ад дарогі, якая вядзе з горада Ціхвін на захад. Азвярэлы вораг з усёй сілай імкнуўся шматлікімі атакамі зламаць нашу абарону і другім кальцом блакады ахапіць горад-герой Ленінград.

Вечарам 6-га лістапада праводзіліся гутаркі аб Кастрычніцкай рэвалюцыі. На камсамольскім сходзе мы падзяліліся ўспамінамі аб сустрэчах Кастрычніцкага свята да вайны. Мы пакляліся аддаць усе свае сілы ў барацьбе з ворагам.

Так пачынае свой артыкул «Кастрычнік у дні баявыя» студэнт фізіка-матэматычнага факультэта С. Кісляко.

Універсітэт, які амаль поўнасцю быў разбуран вайной, загойваў свае раны, рос, мацнеў, набіраў сілы. На старонках газеты змяшчаліся здымкі новых, а на сягонняшні дзень ужо старых кабінетаў, бібліятэк, дзе студэнты займаліся сваёй творчай дзейнасцю. У вачах міжволі адразу ж паўстаюць і сягонняшнія здымкі нашага універсітэта, маладога, велічнага, прасторнага, з мнагатысячным калектывам студэнтаў, выкладчыкаў, дацэнтаў, прафесараў. Якая вялікая розніца ў размаху будаўніцтва, у запатрабаваннях людзей. Але і ў тыя далёкія пасляваенныя гады кожны, хто быў звязан з універсітэтам, хацеў надаць яму найлепшы выгляд. Сіламі студэнтаў будаваліся не толькі новыя карпусы, але і прыводзіліся ў парадак старыя. Характэрна, што на старонках газеты Беларускага універсітэта можна было часта адшукаць крытычныя артыкулы, фельетоны, якія трапна высмейвалі тых людзей, якія не па-гаспадарску адносіліся да сваёй навучальнай установы, не бераглі дзяржаўную маёмасць, не праводзілі рамонт лабараторый, кабінетаў, інтэрнатаў.

Для прыкладу, чытаем газету ад 29 лістапада 1948 года. Артыкул «Інтэрнат не падрыхтаван да зімы».

Навокал інтэрната страшэнная гразь. Аднак ні прафком, ні студком не арганізавалі студэнтаў на ўборку двара. Прафком не паклапаціўся аб тым, каб упрыгожыць інтэрнат заклікамі і плакатамі. Вітрына для газет — без шкла і без газет.

(Заканчэнне ў наступным нумары).

А. СВОРАБ.

Зак. 1584 АТ 17630 Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Рэдактар М. ІОСЬКА.